«Памежная сітуацыя» у беларускай антыўтопіі з'яўляецца пускавым механізмам, які дапамагае экзістэнцыі праявіць сябе, актуалізавацца ў дзеяннях і паводзінах чалавека. Яна адкрывае сапраўднае быццё. Жорсткія абставіны ў антыўтопіі падаўляюць асобу, імкнуцца падначаліць яе створанай сітуацыі. У гэтай барацьбе паказваецца нязломнасць чалавечага духу, адстойваецца яго воля да самавыяўлення. Трагічны фінал беларускай антыўтопіі нібы спыняе імгненне і прасвятляе асобу, дае надзею на рэалізацыю «казкі жыцця».

Выразна акрэсліліся антыутапічныя інтэнцыі ў беларускай мастацкай культуры праз сімвалы сучаснасці: «знак бяды», «сцюжа», «вогненная яма» і інш. Антыўтапічная семантыка паказвае механіку духоўнага і фізічнага знішчэння і падаўлення асобы. Топас «зона» адлюстроўвае асноўныя сацыяльныя і духоўныя праблемы беларускага грамадства ХХ–ХХІ ст. Ён сфарміраваны як вынік Чарнобыльскай катастрофы ў творах Г. Вашчанкі («Зорка Палын», «Зона стронцыю»), С. Давідовіча («Зона»), М. Савіцкага (цыкл карцін «Чорная быль»). Зона – тэрыторыя адчужэння, забруджвання, смерці. «Казка жыцця» ператвараецца ў антыўтопію.

Сувязь ідэалу з рэальным сацыякультурным вопытам у беларускай культуры вельмі арганічная і жыццёвая. Нацыянальны ідэал «казка жыцця» мае не толькі вялікае эстэтычнае значэнне, але і выконвае важную сацыякультурную функцыю ў грамадстве. Ён уплывае на фарміраванне пазітыўных адносін да чалавечай экзістэнцыі, годнасці асобы і каштоўнасці зямнога жыцця. Духоўную каштоўнасць «замілаванне да жыцця» А. Швейцар ацэньваў як выратоўны сродак у сітуацыі татальнага крызісу культуры [1]. Выпрацаваныя народнай культурай ідэалы валодаюць вялікім педагагічным патэнцыялам, што неабходна ўлічваць пры фарміраванні ўсёй сістэмы адукацыі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Швейцер, А.* Культура и этика / А. Швейцер. – М. : Прогресс, 1973. – 343 с.

УДК 130.2: 821.161.3

## ВЫЯЎЛЕННЕ «Я»-ЭКЗІСТЭНЦЫІ Ў МАСТАЦКАЙ ПРОЗЕ МЯЖЫ ХХ–ХХІ СТАГОДДЗЯ

*Т. М. Тарасава*
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, Мінск, Беларусь

*На матэрыяле твораў беларускіх пісьменнікаў Васіля Быкава, Віктара Казько, Юры Станкевіча аналізуюцца шляхі выяўлення «я»-экзістэнцыі ў мастацкай прозе мяжы ХХ–ХХІ стагоддзя. У айчыннай літаратуры ідзе інтэнсіўны пошук новых форм пазнання чалавека і свету: сфарміравалася ўстойлівая тэндэнцыя бачыць свет у шматграннасці ўсіх яго выяў, творам спецыяльна надаецца парадыйны характар, межы паміж рэальным і фантастычным часта бываюць размытыя.*

*Ключаваыя словы: праблема выбару, сітуацыя парога/мяжы, «я»-экзістэнцыя, экзістэнцыяльны абсурд.*

## IDENTIFICATION OF THE «I»-EXISTENCE IN PROSE OF THE TURN OF THE 20TH AND 21TH CENTURY

*T. M. Tarasova*
Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank, Minsk, Belarus

*Ways to identify the «I» - existence in prose of the turn of the 20th and 21th century based on the material of Belarusian writers Vasil Bykov, Victor Kazko, Yuri Stankevich are analysed. There is an intensive search in national literature for new ways of viewing the world and the human being: a steady trend to see the world in diversity of all its images has been formed, works have specially been given the parody nature, the boundaries between the real and the fantastic are often blurred.*

*Key words: the problem of choice, the situation of the threshold/ boundary, the «I» - existence, existential absurd.*

Другая сусветная вайна надзвычай востра актуалізавала праблемы парога/мяжы, выбару, і «інтэлектуальная» проза завастрыла іх з усёй філасофскай глыбінёй. Гэтыя праблемы да маштабных філасофскіх праблем далучыў яшчэ Ф. Ніцшэ («Так говорил Заратустра», «Антихрист»). Нямецкі мысліцель змадэляваў сітуацыю «вялікага разрыву», пакінуўшы чалавека без Бога, без маралі, ведаў, ідэалогіі, у выніку чаго адбылася пераацэнка фактычна ўсіх каштоўнасцей, і свет у тым ліку застаўся без самога чалавека. Безумоўна, такая акалічнасць, калі «ўсё дазволена» і не варта «нічога баяцца»,

была здольна выклікаць дэфармацыю псіхікі, пагражала чалавеку апынуцца ў бездані, але зацягнуць яго «ў бязмежнасць вар'яцтва» філосаф, як лічаць даследчыкі прац Ф. Ніцшэ, не адважыўся. Гэты крок зрабіла прыгожае пісьменства. Сусветная проза другой паловы XX ст. імкнецца спасцігнуць саму сутнасць чалавечага існавання, магчымасць выбару ўласнай мадэлі паводзін, зразумець светаадчуванне эпохі, не даючы пры гэтым гатовых адказаў і рашэнняў. «Мудрасць сумнення» (М. Кундэра) пануе ў літаратуры гэтага часу. Пафас, адкрытая эмацыянальнасць, маралізатарства ёй не ўласцівы. Як вырашае праблемы парога/мяжы, выбару беларуская проза канца XX ст.? Якія аспекты гэтых праблем найбольш актуальныя сёння? Пры любой пастаноўцы пытання відавочна адно: яны даюць магчымасць мастаку зазірнуць у патаемныя куточкі чалавечай душы, у глыбіні падсвядомага. Невыпадкова нямецкі філосаф і сацыёлаг Ю. Хабермас піша, што ў сучасным свеце «…отдельному человеку уже не реализовать свою индивидуальность в одиночку; окажется ли его выбор собственной жизненной истории успешным или нет, зависит от «да» или «нет» других» [цыт. па 2, с. 181].

Здольнасць беларускіх пісьменнікаў мяжы XX–XXI ст. (В. Быкава, В. Казько, Ю. Станкевіча і інш.) працаваць з сітуацыяй выбару сведчыць аб іх жаданні спасцігнуць таямніцы быцця, чалавечую індывідуальнасць у паліфаніі грамадскіх сувязей. Спасціжэнне сутнасці быцця праз маральную памежную сітуацыю без веры чалавека ў Бога, што мы якраз і назіраем у творах названых аўтараў, актуалізавала праблему суадносін маралі і інтэлекту, калі выбар перамяшчаецца ў падсвядомасць, у псіхіку і становіцца бясконцым стрэсам для чалавека.

Верхні падзейны слой твораў названых пісьменнікаў канца XX ст. («Бедныя людзі», «Да сустрэчы…», «Ізумрудна-зялёныя мухі») нескладаны, пад ім схаваны больш глыбокі пласт – філасофска-псіхалагічны. В. Казько, В. Быкаў, Ю. Станкевіч востра адчуваюць духоўны бок быцця, звычайнага, штодзённага, але пранікненне ў псіхіку герояў адбываецца не толькі і не столькі праз сацыяльныя матывіроўкі, а найперш праз экзістэнцыяльныя. Экзістэнцыяльная прастора твораў пабудавана на выбары герояў у сітуацыі парога/мяжы. Мастакоў цікавіць не логіка смерці, фізічнай ці духоўнай (хоць матыў смерці ў творах сюжэтаўтваральны), а логіка жыцця, чалавечай псіхікі, акрэсленых праз матыў парога/мяжы, праз адначасовасць розных поглядаў на свет, няўлоўныя адценні думак, выказаных і нявыказаных слоў. Навакольны свет для герояў В. Быкава, В. Казько, Ю. Станкевіча – гэта свет-пастка, дзе важна намацаць хоць нейкі пункт апоры, каб зразумець, у якім вымярэнні, часавым і прасторавым, яны знаходзяцца. Усе персанажы без выключэння пастаўлены ў сітуацыю выбару/выпрабавання. Пісьменнікі выпрабоўваюць сваіх герояў на «посредственность», і персанажы цалкам адпавядаюць мастакоўскім канцэпцыям, сутнасць якіх у тым, што свет належыць чалавеку «сярэдзіны».

Цэласнасць творчай асобы В. Быкава найперш выявілася ў яго адданасці праблемам ваеннай прозы, дзе галоўнай мэтай пісьменніка быў пошук праўды народнай вайны. У творах В. Быкава канца XX ст. трагедыя чалавека перамяшчаецца пераважна ў псіхіку. Пастаянная душэўная барацьба героя непазбежна вядзе да самаразбурэння асобы, але, па вялікім рахунку, працэс самаразбурэння перманентны. Персанажа-інтэлігента, прафесара аднаго са сталічных ВНУ Скварыша, які не верыць ні ў сяброўства, ні ў каханне, прадстаўляе В. Быкаў у апавяданні «Бедныя людзі». Пабудаванае на суцэльнай падазронасці і шпіёнаманіі савецкае грамадства дэфармуе свядомасць героя настолькі, што ён дэградуе як асоба. Герой не здольны вытлумачыць логіку быцця, і логіка жыцця губляе сваё значэнне. Праблема выбару В. Быкавым увасабляецца ў па-майстэрску прадуманай сітуацыі сустрэчы прафесара і аспіранта, дзе ўсё замкнёна на пытаннях свет без Бога, мараль і інтэлект. Пісьменнік адназначна сцвярджае, што разбурэнне маралі непазбежна цягне за сабой разбурэнне інтэлекту, і прычыны гэтага трэба шукаць не ў знешніх абставінах, а ў самім чалавеку, у яго духоўных асновах. Прафесар Скварыш В. Быкава павінен зрабіць свой выбар: напісаць данос на аспіранта ці мужна зносіць абвінавачванні ў палітычнай ненадзейнасці. Напружаная ўнутраная барацьба з самім сабой ператвараецца ў самаразбурэнне. Сітуацыя адчужэння героя ад свету (пачынаючы ад унутранага пратэсту супраць несправядлівых абвінавачванняў да адчування сваёй віны, а потым даносу) ёсць працэс руйнавання асобы чалавека, працэс памірання жывой матэрыі.

Герой аповесці В. Казько «Да сустрэчы…» – чалавек з высокім інтэлектуальным патэнцыялам, прызнаны ў свеце Майстар, Мастак, тонкі знаўца чалавечай душы. Дэфармаваная свядомасць беларускага грамадства канца XX ст. прымушае яго адмовіцца ад «себя ставшего» дзеля новага мастацкага эксперыменту, галоўным персанажам якога стане ён сам. В. Казько дакладна мадэлюе схему ўзаемаадносін мастака і грамадства, мастака і рэальнасці ў сістэме каардынат двух светаў: сучаснасць і памяць, жыццё і смерць, сон і рэчаіснасць, ісціна і хлусня. Ланцужок гэтых паняццяў можна працягваць да бясконцасці. Важна зразумець толькі адно: герой В. Казько, свядома зрабіўшы свой выбар, заўсёды на мяжы, на парозе двух светаў. Майстар часта сам шукае гэтыя межы, сам іх стварае, каб выпрабаваць сябе і тых, хто побач. Гэта дапамагае пісьменніку выявіць глыбінную экзістэнцыю чалавека, спасцігнуць вынікі жахлівага самаразбурэння і самазнішчэння праз прызму трагічнай рэтраспектывы Мастака, душа якога «драбніцца», «захлынаецца ад плачу», бачачы «пачварную прывіднасць» сённяшніх дзён.

Філасофскі роздум героя В. Казько канцэптуальны – кожнаму чалавеку адведзены свой час: «А век гэты ўжо канае сам, бо яму ў часа няма чаго прасіць, ды там і не падаюць. Час не зважае і не прызнае жабрацтва, як і таго, якога колеру ты трымаеш сцяг, якому Богу ты молішся. Час не разумее і не ведае «халявы», і пад ім не варта мітусіцца...» [1, с. 48]. Пераход Майстра з быцця ў нябыт спакойны, узважаны, пазбаўлены анталагічнай панікі. Герой валодае здольнасцю бачыць сябе збоку, ён не можа перабудаваць свет, але яшчэ здольны яго асэнсаваць. Жаданне Майстра адрэжысіраваць уласную смерць – гэта выклік «пошлай рэчаіснасці», выклік грамадству, няздольнаму абараніць дзіця, жанчыну, прыроду ад гвалту і насілля. Мастак вострa адчувае працэс дэгуманізацыі жыцця, у публічным эксперыменце над сабой бачыцца жаданне героя дакапацца да глыбінных працэсаў распаду чалавечых сувязяў, асобы, спасцігнуць логіку чыноўніцкай дэградацыі, паказаць, як накопліваюцца сімптомы ракавага недамагання – дэпрэсіі ў грамадстве, як прымірыць пачуццё абсурднасці і несправядлівасці жыцця і неабходнасць жыць. В. Казько, пераадолеўшы ў аповесці ўспрыняцце жыцця толькі ў адным, знешнім, вымярэнні, выйшаў на арбіту экзістэнцыяльнай свядомасці, якая адкрыла магчымасць філасофскага і эстэтычнага асэнсавання свету і чалавека як адзінай найвышэйшай каштоўнасці быцця.

Працэс зараджэння думак – галіна, маладаследаванная псіхалогіяй, – выклікае вялікую цікавасць у сучасных пісьменнікаў. Герой не гаворыць: «Я адчуваў боль, мне страшна». Гэтыя боль і страх паказваюцца «…через сумятицу мыслей и внешних проявлений» [3, с. 35]. Думка, як правіла, не развіваецца, яна толькі абрастае дэталямі, якія з’яўляюцца штуршком да ўспамінаў, роздуму. Аўтар экзістэнцыяльнага светаадчування «овеществляет» матэрыю свядомасці для таго, каб выявіць яе, а потым «…прозреть текучесть и многоликость реальной жизни, любого уходящего мгновения» [3, с. 209]. Менавіта па такім прынцыпе пабудаваны твор беларускага пісьменніка Ю. Станкевіча «Ізумрудна-зялёныя мухі». У ім няма ўступу/завязкі, які падрыхтаваў бы чытача да ўспрымання падзей; твор фактычна вытканы з мікрасітуацый, з раўназначных кавалкаў лёсу-шляху, у галактыку якога закінуты герой: маскоўская будаўнічая фірма, рабаўніцтва ў мясцовай электрычцы, у выніку чаго хлопец застаўся без грошай і дадому не вярнуўся. Гандляваў газетамі ў электрычках, спадзеючыся адпомсціць крыўдзіцелям пры сустрэчы, але часу прайшло многа, і ён адчуў, што пачаў забываць твары рабаўнікоў. Забойства ў начной электрычцы трох цыганоў, нахабных і самаўпэўненых, толькі на першы погляд здаецца выпадковым. Іх агрэсіўныя паводзіны абудзілі ў хлопцу схаваны інстынкт помсты за пакалечанае жыццё, за татальную несправядлівасць. Зброяй помсты стаў рэвальвер, куплены на незабраныя «зялёныя» грошы.

Беларускі аўтар не клапоціцца аб пераходных мосціках, кадр змяняецца новым кадрам, рух якіх стварае карціну аповеду. І чым трагічней падзеі, тым спакайнейшым становіцца тон апавядальнасці, што ў сваю чаргу ўзмацняе разрыў паміж трагізмам чалавечага жыцця і пакорлівасцю, з якой гэтае жыццё ўспрымаецца чалавекам. Балансаванне свядомасці параненага героя на мяжы жыцця і смерці перадаецца пісьменнікам праз шмат разоў паўтораны эпізод цьмянага адчування юнаком пісталета ў руцэ. Ён быццам бы і не хоча прымаць трагічны жыццёвы вынік, але і не бачыць у ім нічога дзіўнага і сам здзіўляецца адсутнасці такога здзіўлення. Парадаксальная сувязь «рэвальвер – жыццё» агаліла глыбокі і горкі іранічны падтэкст апавядання Ю. Станкевіча: век зброі («мадэль вытворчасці 1895 года») аказаўся значна даўжэйшым за век яго спажыўца, да таго ж і разбуральная хада часу ніяк не паўплывала на баяздольнасць пісталета. Такім чынам, у сферы канкрэтнага быцця праз багатую палітру фарбаў разгорнута сапраўдная трагедыя духу. Не час, а ланцужок выпадкаў вынес прысуд юнаку, які канчаткова гіне на шляху гісторыі. Змешчаныя ў пачатку і ў канцы твора вобразы і дэталі (мухі, рэвальвер), зафіксаваныя падсвядомасцю хлопца, што памірае, ствараюць атмасферу хуткаплыннасці і завуаляванасці жыцця. Мікрадэталь («ізумрудна-зялёныя», «нахабна-смелыя», стварэнні, «падлавыя» мухі) у спалучэнні з іншымі дэталямі становіцца сімвалічнай і высвечвае экзістэнцыяльную сутнасць чалавека, яго глыбока схаваныя ад знешняга назіральніка душэўныя працэсы. Невыпадкова экзістэнцыяльную літаратуру называюць «прозай схаванага дзеяння».

Канцэптуальна арганізаваная мастацкая рэчаіснасць у творах В. Быкава, В. Казько, Ю. Станкевіча дае падставы гаварыць пра арганічнае спалучэнне ў мастацкім метадзе пісьменнікаў праблем парога/мяжы, выбару, скіраваных на раскрыццё быційнай сутнасці чалавека ў свеце. Экзістэнцыяльны выбар на межах дапамагае зразумець падтэкст учынкаў, якія мала матываваны знешнімі абставінамі і знаходзяцца па-за станам лінейнага псіхічнага развіцця асобы. Экзістэнцыяльнае светабачанне, якое выспявала ў нетрах традыцыйнага рэалізму, сфарміравала ў творах В. Быкава, В. Казько, Ю. Станкевіча непаўторны тып экзістэнцыяльнага псіхалагізму як цэласнай і завершанай эстэтычнай сістэмы.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Казько, В.* Да сустрэчы… / В. Казько // Полымя. – 1997. – № 5. – С. 22–131.

2. Постмодернизм : энциклопедия / сост. и науч. ред. : А. А. Грицанов, М. А. Можейко. – Минск : Интерпрессервис : Кн. Дом, 2001. – 1037 с.

3. *Шевякова, Э. Н.* Поэтика современной французской прозы / Э. Н. Шевякова ; Моск. гос. ун-т печати. – М. : МГУП, 2002. – 228 с.